**Т. М. Ігнацюк** (Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт, Брэст)

## ГЕРАІЧНЫ ЭТАС І ТРАГІЧНЫ ПАФАС ТВОРАЎ НА ВАЕННУЮ ТЭМУ

1.1. Перадусім неаходна зразумець і інтэрпрэтаваць сутнасць трагічнага, а таксама высветліць і растлумачыць прыроду гераізму. Гераізм не тое, што трагізм. Як смерць не тое, што гібель, як драма не тое, што трагедыя.

Гераізм апеты ў паэзіі; ім напоўнены рамантычныя празаічныя творы. Гераізм мае месца ў жыцці. "В жизни, знаешь ли ты, всегда есть место подвигам, – говорит Изергиль. – И те, которые не находят их для себя, те просто лентяи или трусы, или не понимают жизни" (М. Горький "Старуха Изергиль"). Фраза "*У жыцці заўсёды ёсць месца подзвігу*" атрымала інтэрнацыянальнае крылатае гучанне.

Усё сапраўды гераічнае мае высокае драматычнае дыскурсіўнае гучанне. Тут і злосць на другіх, што не трымаюцца свайго ганаровага абавязку памерці за Радзіму-маці: "*Злосна сказаў: "Уставай, пяхота! Мы не на пляжы, а на вайне*" (П. Панчанка "Герой"). Тут і гатоўнасць пайсці на смерць дзеля другіх: "*І лёг на змяіныя скруткі дроту. І дзвесце салдацкіх запыленых ботаў Прайшлі па яго спіне*". Тут і жаль-шкадаванне, што "*Не ён, а другія ішлі ў атаку, Гранаты кідалі ў бліндажы, Калолі фрыцаў, палілі танкі І сцяг перамогі ўзнімалі ранкам На заваёваным рубяжы*". Тут і вялікія пакута Героя, на якую не можа не адазвацца сэрца чытача: "*А ён свае косці з іржавых калючак Сваімі рукамі без стогну аддзёр, Зваліўся на травы...*". Тут і вялікі боль страты за палеглага ў баі: "*... і стала балюча І травам, і росам, і ветрам гаючым, Што прыляцелі з валдайскіх азёр*" (П. Панчанка "Герой"). Смерць Героя заўсёды хвалююча драматычная. Герой памірае ціха.

Падставовая рыса гераічнага – гэта адданасць. Герой добраахвотна аддае жыццё за ідэал ("*И как один умрем в борьбе за это...*"). Памерці за Радзіму для Героя – найвялікшы гонар, пачэсны абавязак. Герой па абавязку пайшоў на вайну, дзе і знайшоў сваю пачэсную смерць – аддаў жыццё, каб жылі другія. Смерць героя – паэзія найвялікшай узнёсласці.

Подзвіг Героя можна паўтарыць двойчы, тройчы і г.д. і, адпаведна, атрымаць званне Героя.

На думку венгерскай даследчыцы Е. Анчэл, “у адрозненне ад маралі этас канцэнтруе ў сабе такія духоўныя пачаткі, якія не праяўляюцца ў штодзённым жыцці. Чалавек, дзеянні якога дыктуюцца эпасам, здзяйсняе нешта выключнае, тое, што выходзіць за межы звычайных уяўленняў і ўчынкаў, нешта, што не паддаецца звычайнаму рацыяналістычнаму тлумачэнню. Падставай гераічнага этасу, як любога другога, з’яўляецца незвычайнае (надзвычайнае) [1].

Этас – канцэпт гістарычны. Прыклады гераізму можна знайсці ў гісторыі любога народа. У этасе, як і ва ўсім, што адносіцца да гістарычнага плана, мае месца пачатак (крыніца). Шукаюць вытокі гераізму. Аднак у этасе няма архэ (зыходу). Кола і рух гісторыі не тое, што спіраль развіцця з яго ходам. Этас, як і любое слова, мае праект, аднак у яго няма наступстваў і перспектывы. У гістарычным этасе няма справы. Справа належыць архаічнаму пафасу.

Усе пачуцці, якія нараджаюцца ў душы чалавека, можна выказаць у рамантычным творы. Усё можна выказаць мастацкім словам, акрамя аднаго – невыказнага. Тое, што нельга выказаць словам, дапускае выражэнне. І тады на змену імпрэсіі жыцця прыходзіць экспрэсія быцця. Замест гаваркога слова – выразная формула называння, а замест звання – тытул. Замест зову (гука) – тон (голас). Герой ідзе на смерць па зову сэрца, ці калі Радзіма-маці заве. Месца Героя паміж Званымі, а не сярод абраных. Званых мноства, абраных – адзінкі. І толькі адзінкавыя здольныя на ахвяру. Аддае жыццё Герой, а таго, хто ахвяруе, так не завуць. Увогуле яго ніяк не завуць – яго называюць – безыменна (дэскрыптыўна) ці пайменна (іменем уласным). Ахвяра не памірае, але гіне. Яго не завуць, ён свядома САМ ахвяруе сабой (ці яго самога прыносяць у ахвяру). Ахвяра прадугледжвае асабісты ці калектыўны свядомы выбар. Ахвяру выбіраюць. Так выбіралі ахвяру паганскім багам.

У гераічнага этасу няма свядомай самасці, яна – у патэтычнай ахвярнасці. Ахвяра не памірае, але гіне ў паходзе за Славай. Гібель не апяваюць. У гібелі адсутнічае гераічны пачатак. Няма таксама там і паказнога гераізму. Найвялікшая чэсць усіх палеглых герояў не раўняецца са СЛАВАЙ тых, хто загінуў – паўшых. Героем завуць чалавека, які палажыў галаву дзеля другіх, а не паў у Імя Самога. Таго, хто паў, не завуць, але называюць (тытулуюць). Не бывае палеглых ахвяр – ахвяры бываюць паўшыя (“*Вы жертвою пали в борьбе роковой*...”). Славяць тых, хто паў ахвярай. Не бывае чэснага імені – імя бывае слаўнае. Той, хто ахвяруе сабой, не добраахвотна ідзе на подзвіг, а свядома

прыносіць самога сябе ў ахвяру, зыходзячы з разумення яе неабходнасці ("*Хто, калі не я*").

Памерці, чэсна выканаўшы свой салдацкі абавязак перад Радзімай, ці ахвяраваць сабой, усведамляючы ўласны доўг Айчызне? Дошка Гонару з подпісам пад партрэтам ці безымянны Курган Славы, помнік з выбітымі літарамі імён ахвяр? Медаль за адвагу, за баявыя заслугі ці ордэн Славы – за праяўленую мужнасць? Святы доўг ці свяшчэнны абавязак?

Галоўны параметр трагічнага пафасу – незваротнасць. У бытавым сэнсе зваротнасць звязана з дзеясловам *звярнуцца* (напр., звярнуцца да каго-небудзь з просьбай). Зварот – гэта паварот да пачатку, назад, да сваіх каранёў ("на кругі своя"). Парадокс у тым, што звярнуцца не значыць вярнуцца. Усё, да чаго мы звяртаемся, да нас не вяртаецца і нам не застаецца. Яно нам можа быць сваім, але не нашым. У пафасе няма звароту, аднак ёсць вяртанне. Вяртанне да Самога – самога Сябе, Самога Бацькі (параўн.: Вяртанне марнатраўнага сына), вяртанне да САМОГА. Іншая назва для незваротнасці – апелятыўнасць. Усякая назва апелятыўная (дыскрыптыўная) ці іменная. Апелятыўна-іменнае застаецца ў памяці – упісваецца ў Кнігу памяці. Яно толькі і ёсць, ім адным толькі і цешацца, астатняе – прысутнічае на белым свеце для ўсеагульнай радасці.

1.2. Пафас у творах з ідэйнай арыентацыяй не мае гістарычных вытокаў, аднак вынікае з суб'ектыўнага светаразумення аўтара і аб'ектыўных сацыяльна-бытавых абставін, якія пісьменнік усведамляе і імкнецца выразіць Зыходзячы з адзначанага, канстатуецца існаванне розных тыпаў пафасу – як пазітыўнага, так і негатыўнага. Перш за ўсё, пафас бывае трагічным і гумарыстычным. Тыпы пафасу ўзнікаюць наперш у грамадскай свядомасці, а потым знаходзяць выражэнне ў творчасці асобных яго прадстаўнікоў – майстроў пяра. І ў трагічным, і ў гумарыстычным пафасе праламляецца ідэйнае і эмацыянальнае асэнсаванне рэальных супярэчнасцяў.

Гераічны этас сцвярджае веліч подзвігу асобнага чалавека і ўсяго грамадства, што мае вялікае значэнне для народа, асобных яго прадстаўнікоў і чалавецтва ў цэлым. Прадметам гераічнага этасу ў літаратуры з'яўляецца героіка самой рэчаіснасці – стваральная праца па ажыццяўленні грандыёзных планаў будаўніцтва новага грамадства.

Змест героікі адрозніваецца ў розных гістарычных абставінах. Авалоданне стыхіямі прыроды, адпор іншаземным захопнікам, змаганне з цёмнымі сіламі грамадства за перадавыя формы грамадска-палітычнага жыцця – усё гэта патрабуе ад чалавека вялікіх намаганняў, падпарадкавання сваіх мэтаў грамадскім. У гэтым выпадку чалавек мабілізуе свае сілы, атрымлівае адпаведнае натхненне і здзяйсняе гераічныя ўчынкі і подзвігі.

Героіка жыцця патрабуе добраахвотнага выяўлення чалавека як грамадскай асобы, яе дзейснай ініцыятывы і гатоўнасці ісці на подзвіг. Адлюстраванне ў дзеяннях асобнага чалавека, пры ўсёй абмежаванасці яго сіл, вялікіх прагрэсіўных памкненняў – такая станоўчая ўнутраная супярэчлівасць героікі жыцця.

Вобразна раскрываючы асноўныя рысы гераічных характараў, захапляючыся імі і апяваючы іх, мастак слова стварае творы, прасякнутыя гераічным этасам. Ён не проста прайгравае і эмацыйна каментуе героіку рэчаіснасці, а творча пераасэнсоўвае яе ў святле свайго ідэалу грамадзянскай доблесці, гонару, абавязку. Ён ператварае жыццё ў вобразны свет твора, выказваючы сваё ўяўленне пра подзвіг, пра сутнасць гераічнага характару, яго лёсу і значэння. Героіка рэчаіснасці адлюстроўваецца ў мастацкім творы гіпербалічна ў створаных вобразах і дзеяннях. Гераічны этас у мастацкіх творах розных эпох нярэдка ўскладняецца драматычнымі матывамі. Перамога над ворагамі заваёўваецца коштам жыцця герояў і пакут усяго народа.

Гераічны этас перадае значныя сацыяльна-прагрэсіўныя памкненні, і ў першую чаргу, барацьбу за незалежнасць (волю) краіны. Гераічным этасам прасякнуты творы беларускіх пісьменнікаў на ваенную тэму. Калі браць беларускае прыгожае пісьменства, то нельга не прывесці творы А. Куляшова, Я. Брыля, А. Пысіна і інш.

1.3. Вялікая Айчынная вайна стала глабальнай трагедыяй XX ст., загубіла жыцці мільёнаў людзей; дзясяткі мільёнаў сталі інвалідамі. Менавіта таму гераічны этас беларускай літаратуры часоў вайны суіснуе ў адзінстве з трагічным пафасам, які праявіўся падчас суровых выпрабаванняў, што выпалі на долю жыхароў Беларусі.

Вайна не мае літасці, з'яўляецца антыгуманнай жахлівай падзеяй. Перамозе неабходныя чалавечыя ахвяры. Узнікае аналогія вайны і жніва: "*Дзве жняі, загонную паланіўшы раць, выйшлі, каб палонныя каласы вязаць. Наступіла з Поўначы першая жняя, а другая, звонячы зброяю, – з Паўдня*" [3, с. 308]. Вайна даносіцца з-за Буга грымотамі: "*Бяда з-за Буга ў касцы выглядала, і данеслася водгулле грымот*" [4, с. 29].

Вайна параўноўваецца з машынай, якая знішчае ўсе жывое: "*Ашчэрыла жэрлы вайна без літасці... Колькі працы яна, колькі сілы смяротнай выплеўвае...*" [3, с. 185]; "*Зямля нязжатымі снапамі подперла бледны небаскрай, вайна жалезнымі цапамі малоціць наш пярэдні край*" [4, с. 9]; "*Мы ў танкавым едзем злучэнні, ад гарачых турбот падваскамі пот. Перад намі снуюць і злучаюцца цені ад крылляў, ад вежаў, ад жэрлаў варожых істот...*" [3, с. 187]; "*Глядзі, зразае вайна як пілой, усе, што жыло, што расло, што сеялі...*" [3, с. 183].

Прыйшла агульная бяда. Вораг руйнуе зямлю і ўсё нашае, адвечнае, хоча назваць сваім. Гэтыя нелюдзі маюць намер перамагчы, наступіць ботам нам на шыю, нашу радзіму назваць Германіяй, выгнаць нас назаўсёды з нашай зямлі. Таму стаўленне да ворагаў адразу негатыўнае. Яны параўноўваюцца з "*чорнымі гасцямі*", "*чужынцамі азвярэлымі*", "*злачынцамі ліхімі*", "*карычневай чумой*", "*д'ябламі*", "*няшчасцем*", "*чужакамі*": "*Як пакінулі чорныя госці сяло, у якім пагулялі нямала...*" [3, с. 60]; "*Таму чужынец азвярэлы снарады ўвінчвае ў пласты*" [4, с. 9]; "*Раззлавалася, стала няшчасце зяленым зусім. – Партызан! – закрычала – ваш матка, мы знаем аб тым*" [3, с. 245]; "*Д'яблы большае кары прыдумаць бы ім не маглі, як закінуць за хмары, навек адарваць ад зямлі. Іх калыша вятрыска за хмарай, чужынцам на смех*" [3, с. 260]; "*Злачынцаў ліхіх – далакопаў старых – я сам адспяваю спачатку, і хай тады вечнасці на песнях маіх нявечнасці ставіць пячатку*" [3, с. 102]; "*Даганяць свае песні на ўсход ён пайшоў, іх чужынцы прашналі...*" [3, с. 72]. Да гэтых чужынцаў няма літасці, іх трэба знішчыць, прагнаць з беларускай зямлі.

Фашысты прыпадабняюцца да "*цемры*"; іх сімвал – "*чорны воран, які кружыць над Радзімай*". Гэты старажытны эпічны сімвал ва ўсе часы ўвасабляў ворага: "*фашысцкая сіла цёмная*", "*крылы чорныя*", "*гнілая фашысцкая нечысць*". Вайна – барацьба з нечысцю – успрымаецца як ачышчальная і свяшчэнная, як вайна народная. Людзі, што змагаюцца з ворагам, таксама ўвасабляюцца сімвалічна: "*Не помню ўжо сержантаў тых, што пасвячалі ў віцязі*" [4, с. 23]; "*Трывогі ўцекача не пакідалі; ператварыўся б зараз у ваўка; у ворана... І жыў бы ў гэтым лесе, пракляўшы чалавецтва і вайну*" [4, с. 5]; "*Я не герой, не Мурамец Ілья*" [4, с. 27].

Няма ніводнай сям'і, якой бы вайна не прынесла пакуты. Антытэза праяўляецца ў наступных словах: "*варожая ласка*", "*казка вайны*": "*Ды ўвагналі ў магілу іх сілу варожыя кулі, рукі хочуць яшчэ да грудзей прытульць сваіх сірат, ды з варожае ласкі паганай дол цесны ім вырыт...*" [3, с. 63]; "*Бо то казка зімовая – праўда суровая, а калі нават і казка, дык іншая, новая. Казка Айчыннай вайны і лясное палянкі, не каралевіч заснуў там, а сын партызанскі. Сын партызанскі!*" [3, с. 45].

Вайна была сапраўдным выпрабаваннем для чалавека, для яго пачуццяў, характару. Важна было не страціць свае лепшыя якасці сярод усіх жахаў вайны. Спраўляліся з гэтым не ўсе, а толькі моцныя асобы. Некаторыя здрадзілі, перайшлі на бок ворага. Яны параўноўваюцца з "*іудай*", называюцца "*прадажнікамі*", "*прыслугачамі нямецкімі*"; "*Ладзіць гэта вяселле Мядзведскі – прыслугач нямецкі*" [3, с. 209]; "*Кінь ты, баце, пілікаць ў хаце нямецкага зяця*" [3, с. 211]; "*– Салаўкі, – ён крычыць, –*

*Салаўкі мяне вывелі ў людзі! І выходзіць на хату Смірноў, наш таварыш Зарудны: – Ты, – гаворыць,– не ў людзі пайшоў, а ў іуды...*" [3, с. 212]; "*А часам падае руку з нянавісцю сяброўскай місіі прадажнік той, што на вяку ў мяне не выманіць амністыі...*" [4, с. 23] .

Людзі, якія ваявалі ў імя адной мэты, былі *сябрамі, братамі, баявымі таварышчамі, камуністамі:* "*Паміраў наш таварыш. Хацелася дужа яму бачыць заўтрашні дзень...І ен так гаварыў нам, айчына:* "*Хто з вас жыць застанецца, аддаю свае вочы таму – на будучыню глядзі і маімі вачыма*" [3, с. 188]; *Абняла па чарзе нас Праскоўя:* "*Праважаю вас, таварышчы, нібы родных сыноў я...*" [3, с. 207]; "*Б'ецца з ворагам сын-камуніст, што ў чырвоным войску*" [3, с. 209].

У літаратуры перыяду Вялікай Айчыннай вайны гераічны этас суіснуе ў адзінстве з трагічным пафасам. Радзіма, вайна, смерць і неўміручасць, нянавісць да ворага, баявое братэрства і таварыства, каханне і вернасць, мара аб перамозе, роздум пра лёс народа – вось эпічныя матывы ваеннай паэзіі і прозы. Траічным пафасам прасякнута літаратура на ваенную тэму; яна нібы ўвайшла ў вайну, а вайна з усімі яе батальнымі сцэнамі і бытавымі дробязямі ўвасобілася ў літаратуры.

**Літаратура**

1. Анчел, Е. Этос и история: пер. с венгер. / Е. Анчел. – М. : Мысль, 1988.
2. Брыль, Я. Птушкі і гнёзды : выбранае / Я. Брыль. – Мінск : Маст. літ., 2006. – 463 с.
3. Куляшоў, А. Паміж наступным і былым / А. Куляшоў. – Мінск : Маст. літ., 1995. – 542 с.
4. Пысін, А. Вярбовы мост / А. Пысін. – Мінск : Маст. літ., 1974. – 160 с.